Ляйко Н.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## РОЛЯ ДЗІЦЯЧЫХ І ШКОЛЬНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ ВУЧЭБНЫХ ПРАГРАМ

Трэба адзначыць існаванне новых падыходаў у навучанні і выхаванні дзяцей і падлеткаў на сучасным этапе. Перш-наперш гэта адбілася на павелічэнні колькасці гадзін, прадугледжаных вучэбным планам на вывучэнне роднай мовы і гісторыі Беларусі, увагі да арганізацыі краязнаўчай работы, нацыянальнага мастацтва, падрыхтоўкі творчай асобы да жыцця ў новых умовах. Пры вырашэнні гэтых пытанняў у настаўнікаў аказалася шмат праблем, адной з якіх з'яўляецца недахоп новых падручнікаў па гісторыі і тэрміналагічных слоўнікаў, метадычнай і навукова-пазнавальнай літаратуры. На жаль, у некаторых школьных бібліятэках недастаткова навіт літаратуры для пазакласнага чытання на беларускай мове.

У сувязі з гэтым неабходна вызначыць месца дзіцячых і школьных бібліятэк у рэалізацыі агульнаадукацыйных праграм, арганізацыі штодзённай самааду-кацыі. Патрэбна таксама навучыць дзяцей і падлеткаў любіць кнігу, карыстацца бібліятэкай.

Заўважым, што ў Беларусі ёсць добрыя практычныя напрацоўкі па сумеснай рабоце дзіцячых і школьных бібліятэк, накіраванай на адраджэнне гістарычнай спадчыны і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей і падлеткаў. Праведзенае намі даследаванне аб сумеснай дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк у г. Мінску сведчыць аб гэтым. Для работнікаў Цэнтралізаванай дзіцячай бібліятэчнай сістэмы быў арганізаваны семінар «Аб Беларусі з любоўю» , на якім абмяркоўвалася пытанне аб тым, як лепш раскрыць кніжны фонд на беларускай мове і садзейнічаюць яго распаўсюджванню сярод вучняў. Вырашана было дзейнічаць сумесна са школьнымі бібліятэкамі горада. Каб лепш арганізаваць гэтую работу, асабіста для работнікаў школьных бібліятэк быў праведзены семінар-практыкум на тэму «Якой павінна быць школьная бібліятэка сёння».

У сувязі з павелічэннем сферы ўжывання беларускай мовы, адраджэннем гістарычнай памяці выву-чылі попыт дзяцей і падлеткаў на беларускія выданні на аснове картатэкі адказаў, улічылі рэкамендацыі на-стаўнікаў, літаратуру па праграмах. Пачалася сапраўд-ная работа па папаўненню бібліятэчнага фонду адпаведнай літаратурай.

Трэба адзначыць, што, акрамя работы па камплектаванню кніжнага фонду неабходнай літаратурай, вядзецца адпаведная работа па яго раскрыццю: у бібліятэках зроблены надпісы ў нацыянальным стылі, прыгожа аформлены паліцы.

Штомесячна для дзяцей арганізуюцца адкрытыя прагляды новай літаратуры («Дзень біялогіі», «Дзень фізікі», «Гістарычная літаратура» і інш.).

Асабліва шмат увагі работнікі бібліятэк надаюць збору матэрыялаў у дапамогу вывучэнню гісторыі Бацькаўшчыны. Уся новая літаратура заўсёды знаходзіцца на відным месцы. Своечасова праводзяцца прагляды і агляды кніг серыі «Старонкі гісторыі нашай Радзімы». Але асаблівай увагі заслугоўвае цыкл мерапрыемстваў «Зоркі Белае Русі». Вельмі важна, што ўсе мерапрыемствы праводзяцца з улікам узросту школьнікаў. Так, для вучняў 4 класа праводзяцца гутаркі «Ефрасіння Полацкая», «Францыск Скарына» і інш. У пяцікласнікаў выклікаюць цікавасць літаратурныя чытанні на тэмы «Прыгоды герояў, якім пастаўлены помнікі», «Дзед Талаш і Сымон-музыка на праспекце Скарыны», а таксама гістарычныя чытанні на тэмы «Адкуль пайшоў род?», «Адкуль пайшла Беларусь?» Вучняў 7--9 класаў больш цікавяць сучасныя матэрыялы, літаратура аб адраджэнні Беларусі. Таму іх часцей знаёмяць з творчасцю знакамітых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, гісторыяй Беларусі ў літаратурных вобразах, беларускімі мастакамі, скульптарамі.

Мы лічым вельмі важнымі працяг зладжанай работы супрацоўнікаў дзіцячых і школьных бібліятэк па рэалізацыі праграм «Родная мова» і «Спадчына», работу ў дапамогу вучэбнаму працэсу. Мэтазгодна ў далейшым павышаць інфармацыйную функцыю дзіцячых і школьных бібліятэк.

Акуліч У.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## МАГЧЫМАСЦІ БІБЛІЯТЭКАРА ЯК АРГАНІЗАТАРА ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ І ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ

У пачатку 80-х гадоў у ЗША, Канадзе, Францыі, Германіі ўзнікла з'ява, названая функцыянальнай непісьменнасцю. Праблема аказалася настолькі вострай, што 1990 год па ініцыятыве ЮНЕСКА быў абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН Міжнародным годам пісьменнасці.

У нашай рэспубліцы ўзровень культуры дастаткова высокі. Але і ў нас назіраюцца з'явы, звязаныя з паніжэннем адукацыйнага і выхаваўчага ўзроўню насельніцтва. Дастаткова паглядзець рэспубліканскую прэсу.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

На наш погляд, у першую чаргу мы павінны звярнуць увагу на дзяцей як на будучы інтэлектуальны і творчы патэнцыял рэспублікі. Калі ў дзяцінстве пачаць развіваць інтэлект і творчыя здольнасці, то мы можам атрымаць яркую, усебакова развітую асобу.

Магчымасць бібліятэк у галіне адукацыі, выхавання і творчай арганізацыі вольнага часу цяжка пера-ацаніць. Акрамя гэтага, бібліятэка мае такія магчы-масці, якія не мае ніводная ўстанова культуры і адукацыі, ніводны сродак масавай інфармацыі. У бібліятэку чытач прыходзіць таму, што адчувае неабходнасць у кнізе. Тэлебачанне, кінатэатры, дамы культуры прапануюць свой сённяшні рэпертуар. Бібліятэка можа прапанаваць чытачу любы твор, напісаны са старажытных часоў да нашых дзён.

Бібліятэка выконвае шэраг функцый: захоўвае духоўную спадчыну чалавецтва, распаўсюджвае яе ў часе і прасторы, служыць развіццю навукі і тэхнікі, літаратуры, з'яўляецца апорай для рэлігійнай, палітычнай, грамадскай дзейнасці, выкарыстоўваецца ў эстэтычным, этычным выхаванні, прафесійнай адукацыі насельніцтва.

Вельмі значная роля бібліятэкі ў развіцці інтэлекту. Па меркаванню вучоных, за кошт чытання інтэлект развіваецца на 90 % . Больш таго, як сведчыць Памела Спейс Рычардс, даследаванне ўплыву чытання на дзіцячую аўдыторыю паказала, што дзеці, якія ўзраслі на тэлевізійных перадачах, паказваюць такія ж цяжкасці ў галіне мысліцельнай дзейнасці, як і вучні каледжаў з непаўнацэннымі навыкамі інтэлектуальнага развіцця. Аднак дзіця, якое будзе толькі чытаць, не зможа стаць шматграннай асобай. Яму неабходна развіваць і творчыя задаткі ў гульні, маляванні, музыцы, скульптуры і г.д.

Зыходзячы з вышэйсказанага, мы мяркуем, што ёсць сэнс увесці ў нашым універсітэце спецыяльнасць «бібліятэкар-арганізатар інтэлектуальнай дзейнасці дзяцей». Спецыялісты гэтай спецыялізацыі павінны валодаць, акрамя іншага, методыкай выкладання музыкі, малявання, лепкі, шыцця, макрамэ і інш. Гэта не менш важна, чым інтэлектуальнае развіццё. На думку вядомага педагога Сухамлінскага, у дзяцінстве чалавек павінен навучыцца хоць адну справу рабіць добра. Гэта ў далейшым пазбавіць яго ад комплексу непаўнацэннасці.

На асобым палажэнні павінна быць майстэрства акцёра. Гульня ў дзяцінстве з'яўляецца адным са сродкаў пазнання свету. Разам з тым менавіта выхаванне акцёрскіх якасцей дапаможа выхаванню ў падлетка адэкватнага рэагавання на ўзнікаючыя неспрыяльныя сітуацыі, узмацніць і абагаціць эмацыянальныя рэсурсы і камунікацыйныя магчымасці чытача, дасць магчымасць развіць здольнасці да творчасці, выхаваць у сабе валявыя якасці, здольнасць да самарэгулявання.

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага мы мяркуем, што для студэнтаў данай спецыялізацыі павінен быць вучэбны план.

Ён можа складацца з наступных блокаў дысцыплін:

1) агульнанавуковыя,
2) бібліятэчна-інфармацыйныя,
3) тэхналогія адукацыі і разнастайных відаў творчасці,
4) методыка развіцця інтэлектуальнай дзейнасці.

На наш погляд, такі спецыяліст зможа паспяхова працаваць ў якасці бібліятэкара дзіцячай, школьнай, юнацкай і публічнай бібліятэк. У яго дастаткова ведаў, каб на базе бібліятэкі арганізаваць гурток, аб'яднанне ці клуб па інтарэсах. Такі спецыяліст зможа быць таксама і гувернёрам, і выхавацелем у старшых групах дзіцячага сада і граматна выхоўваць сваіх дзяцей.

Кузьмініч Т.В.,
аспірантка

## СПАЖЫЎЦЫ ГІСТАРЫЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ІХ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПАТРЭБНАСЦІ

Атрыманне чалавекам інфармацыі як крыніцы ведаў аб навакольным асяроддзі з'яўляецца адной з асноўных яго патрэбнасцей. Даследаванне і разуменне любой з'явы грамадскага жыцця немагчыма без гістарычнага падыходу. Гісторыя вывучае мінулае чалавецтва ва ўсёй яго дакладнасці і разнастайнасці і робіць магчымым выяўленне заканамернасцей сучаснага развіцця грамадства.

Патрэбнасць у даследаванні гістарычнага мінулага характэрна для кожнага пакалення людзей, пры гэтым, чым больш значныя пераўтварэнні адбываюцца ў грамадстве, тым больш узрастае і паглыбляецца імкненне пераасэнсаваць мінулае. Па словах М.А.Бярдзяева, гістарычныя катастрофы і пераломы заўсёды выклікалі неабходнасць асэнсавання гістарычнага працэсу, пабудовы той ці іншай філасофіі гісторыі.

Імкненне да ўсебаковага і глыбокага асэнсавання мінулага спрыяе, з аднаго боку, актывізацыі цікавасці да вывучэння гістарычных крыніц (гістарычная інфармацыя апасродкавана гістарычнымі крыніцамі, якія засталіся ад пэўнай эпохі), з другога – рэзкаму павелічэнню дакументальнага патоку гістарычнай тэматыкі. Гэтым абумоўлена ўзрастанне ролі крыніц другаснай інфармацыі і адпаведна патрабаванняў да іх. Шляхі ўдасканалення сістэмы другаснай інфармацыі гістарычнай тэматыкі могуць стаць больш акрэсленымі пры ўмове дэталёвага вывучэння дакументальнага патоку галіны і інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

Даследаванне каналаў інфармацыя--спажывец, фарміраванне інфармацыйных патрэбнасцей і асаблівасці іх задавальнення былі аб'ектам разгляду ў шэра-